# ЗМЕСТ

**АНАСТАСІЯ МЕЛЬНІК.** Два апавяданні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
**ВАЛЯНЦІНА ШТОП.** Мара лепшай чысціні. *Вершы* . . . . . . 11
**МАКСІМ КУХЛЕЎСКІ.** Чыстыя думы. *Вершы* . . . . . . . . . . . . . . 12
**ЮЛІЯ МІРОНАВА.** Зялёнка. *Апавяданне* . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
**АРЦЁМ ТУЛУЕЎСКІ.** Упасці насустрач каханню.
*Апавяданне* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
**ІРЫНА РАДЗІХОЎСКАЯ.** Голас вечнасці. *Вершы* . . . . . . . . . . 22
**МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ.** Ваўкалакі. *Неагатычны раман.*
*Працяг* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26

**ПЕРАКЛАДЧЫЦКІ ДЭБЮТ**

**ХАНЬ СУН.** У пошуках луна. *Пераклад з кітайскай*
*Паліны Марозавай* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60

**ПЛЮС-ВАЙБ**

**АРЫНА ПРАНІКАВА.** Хто ты сёння: бард ці чараўнік? . . . 73

**СТАРОНКА РОДНАЯ**

**ЖАННА МІУС.** Мой горад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78

**З МАЛАДОСЦЮ Ў СЭРЦЫ**

**ВІКТАР ЯРАЦ.** Зямля і неба мамы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

**ЛЮСТЭРКА ЛЁСУ**

**АЛЯКСАНДР РАДЗЬКОЎ.** Гарады. *Працяг*. . . . . . . . . . . . . . . . . 84

**ЛІТАРАТУРНЫ СВЕТ**

**ЯЎГЕНІЯ ЛЯЗО.** На памежжы ўсіх узростаў . . . . . . . . . . . . . . . 92
**РАМАН СЭРВАЧ.** Нібыта праходзіць век . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97

**ЗНАКІ ЭПОХІ**

**АЛЕСЬ МАРЦІНОВІЧ.** З Ленінградам назаўсёды.
Янка Бобрык . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
**ЭМАНУІЛ ІОФЕ.** Перакладчык з сусветным імем.
Васіль Сёмуха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106



# АНАСТАСІЯ МЕЛЬНІК

## Два апавяданні

*Мельнік Анастасія нарадзілася 2 чэрвеня 1994 года ў Мінску. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Працуе там жа старэйшым выкладчыкам.*

### Майская гісторыя ў горадзе М.

*Прысвячаецца ўсім маім сяброўкам, якія ёсць цяпер і якія калісьці былі*

Кажуць, што жаночага сяброўства не існуе. Пра гэта нават песні пяюць. Плёткі і зайздрасць заўсёды перашкаджаюць шчырасці, без якой немагчыма амаль нічога. Часам падобнае сяброўства з'яўляецца папросту скрытым саперніцтвам, дзе кожная хоча толькі самавыявіцца або зацвердзіцца за кошт іншай. У такім выпадку ёсць магчымасць параўноўваць сябе і рабіць выснову, што ты — не горш. Можа, таму мужчыны іншы раз падкрэсліваюць: яны сябруюць не так, у іх прасцей, а галоўнае — больш сумленна. Магчыма, тое сексізм? Але не аб гэтым!

Колькі б і чаго ні казалі, жанчыны працягваюць сябраваць.

Маю часта шанцуе. Гэты месяц, як правіла, усе любяць. Яму пішуць пасты ў сацыяльных сетках. Яго чакаюць і дакладна не хочуць, каб праходзіў хутчэй, як, напрыклад, люты. З-за яго не смуткуюць, як з-за лістапада, а наадварот — радуюцца, таму што звычайна ён прыносіць з сабой цяпло.

Позняя вясна прыйшла і ў наш горад М. Усе пачалі гуляць па набярэжнай уздоўж Свіслачы, зразаць цюльпаны на дачы, чакаць водар бэзу, даставаць сонечныя акуляры і, вядома, планаваць вялікія выхадныя. Тэрасы ўжо займалі палову вуліц, запрашаючы выпіць свежай кавы раніцай і келіх чагосьці духмянага ўвечары. Фатографы адкрылі сезон шлюбных здымкаў, а ля Мінскага мора ўзніклі цяжкасці з паркоўкай.

Я скончыла вячэрні эфір на радыё, наперадзе — тры вольныя дні. Паспрабавала знайсці кампанію на вечар, але беспаспяхова. Сяброўкі былі занятыя: прырода і паездкі, планы і праца. Праз гэта губляць такі вечар не хацелася, таму... Таму, хоць на вуліцы халаднела, я загарнулася ў шалік, накінула на



# ВАЛЯНЦІНА ШТОП

## Мара лепшай чысціні

Вершы

***Штоп Валянціна нарадзілася 7 жніўня 1994 года ў вёсцы Занкі Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў па спецыяльнасці «рэжысура народных абрадаў і свят». Жыве ў Нясвіжы, працуе настаўнікам тэатральнага аддзялення ў дзіцячай школе мастацтваў. Піша вершы і п'есы.***

✦ ✦ ✦

Ёсць музыка вышэй за неба,
Вялікі боль, магутны ціск.
Нам не адчыненыя дзверы,
Палёт душы — то ўверх, то ўніз.

Між намі мост, гудзе зямля,
А ногі косіць прадчуванне.
І доля ў кожнага свая,
І з творчасцю сваё спатканне.

✦ ✦ ✦

Праз сцены, вуліцы, дамы
Цябе я моцна абдымаю,
Няма больш шчасця на зямлі,
Чым быць свабоднай ад адчаю.
Быць дотыкам чужога свету,
Быць марай лепшай чысціні,
Быць самым трапяткім сакрэтам,
Які хаваеш за грудзьмі.

✦ ✦ ✦

Хай шуміць, хай крычыць, хай мроіцца,
Хай за сэрца мяне бярэ,
Але толькі хай калісь скончыцца
Твой пасад у маёй галаве.

✦ ✦ ✦

Я вось такі: то добры і бадзёры,
То злы, негаваркі, зусім чужы.
Я вось такі: то для бацькоў я гора,
То лепшы скарб, якога не знайсці.
Я вось такі: то творчы, то маўклівы.
Я задуменны, ды яшчэ расту.

Дарослым трэба розуму і сілы,
Каб даць мне быць такім,
*як я* хачу.

Фота з архіва В. Штоп



# МАКСІМ КУХЛЕЎСКІ

## Чыстыя думы

Вершы

***Кухлеўскі (Крывіч) Максім нарадзіўся 22 сакавіка 2005 года ў Полацку. Скончыў Полацкі каледж ВДУ імя П. М. Машэрава па спецыяльнасці «пачатковая адукацыя». Творы друкаваліся ў газетах «Полацкі веснік» і «Браслаўская звязда», часопісе «Маладосць», альманаху «Граніца літаратурная». Удзельнік народнай літаратурнай студыі «Наддзвінне». Працуе настаўнікам. Жыве ў Полацку.***

### Зорка Венера

У ціхую сінюю ноч мы пад зоркай Венерай
сядзелі на лаве.
Чыталі радкі пра надзею, пра веру,
каханне...
Я чуў...
А ці чула сама ты, як зоры спявалі,
як быццам анёлы з нябёс прыглядалі за намі?
Пісаў Багдановіч, а з ім яшчэ сотні паэтаў,
пра ціхую сінюю ноч
і пра зорку Венеру.
Празрыстая ціша. У парку старэнькі ліхтар.
Усё не дарэмна. Усё прысвячаецца нам.

✦ ✦ ✦

Ноч,
ціхая,
быццам няясны пакой,
у якім ані столі, ні сценаў
няма.
Толькі я
назіраю з нябёс
за табой —
на чацвёртым паверсе,
з акна.

### Апошняе лета

Рамонкавы луг, малінавы сад,
бялёсыя крылы блакітнага неба...

Такім я запомніў апошняе лета:
гайданне валошак, сівых дзьмухаўцоў
і стройныя сосны з абодвух канцоў
зялёных палёў канюшыны.

Ідуць па дарогах жанчыны,
нясуць свае кошыкі, сумы
і светлыя, чыстыя думы,
а сонца іх стан абдымае
і добрага шляху жадае.



# ЮЛІЯ МІРОНАВА

## Зялёнка

Апавяданне

*Міронава Юлія нарадзілася 6 чэрвеня 1989 года ў Бабруйску. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Працавала ў Беларускім дзяржаўным цырку, рэдактарам часопіса пра падарожжы, капірайтарам у IT. Зараз — галоўны рэдактар часопіса пра здароўе 103.by. Большую частку працоўнай біяграфіі займае публіцыстыка: гайды, інтэрв'ю, агляды. Упершыню ў «Маладосці».*

Вялікая смарагдавая кропля падае на белы дыван. Праз пару гадзін прачнецца мама. Я з жахам уяўляю яе твар, калі яна заўважыць пляму. Але ніякіх сіл нешта з гэтым рабіць няма, у вачах смуга, зялёная кропка расплываецца, скуру — усю цалкам — хочацца сadраць. Мяне ванітуе ад таго, як моцна ўсё свярбіць.

Іду ў душ, хаця гэтага рабіць нельга. Пад халаднаватай вадой становіцца крыху лягчэй, я адкідваюся ў ванне і заплюшчваю вочы. Сёння трэці дзень, вось-вось будзе палёгка. Хутка выпаду з паўдрымоты, у галаву вернецца звыклая яснасць, і я змагу зрабіць хоць нешта карыснае — хаця б узяцца за спіс літаратуры на лета.

Выбірацца з ванны невыносна: пасля кантакту з вадой, а затым з ручніком, скура зусім непакоіцца, некаторыя ранкі агаляюцца, скідаюць з сябе размяклыя коркі. Горш за ўсё справы на слізістых: вадыры там палопаліся і ператварыліся ў невялікія кратары, якія моцна свярбяць. Не разумею, як тое трываць, сорамна казаць маме аб гэтых ранах амаль унутры мяне. Мне вельмі шкада сябе, я плачу.

Зноў іду ў пакой з дыванам, плямай і шклянкай зялёнкі, пачынаю тыкаць у раздражнёныя ранкі ватнай палачкай. Па-над старымі размытымі зялёнымі кропкамі з'яўляюцца новыя: сакавітыя і выразныя. Скуру шчыпле, але я мажу ўсюды, дзе дастаю. Усе ведаюць, што гэта не дапамагае, хвароба не пройдзе, калі яе размаляваць у малахіт, але так прынята. Рытуал з ваткай і зялёнкай быццам супакойвае, запэўнівае, што ты робіш нешта, каб хутчэй ачуняць.

Справіцца з вадырамі на спіне немагчыма. Прадрацца да язвачак праз густыя, доўгія, кучаравыя валасы, каб абеззаразіць язвы на галаве,— таксама. Дапамагчы можа толькі мама, але яна яшчэ дасыпае свой позні суботні сон, а я стаю і вытарашчваюся ў зялёную пляму. Правільна, што не расцірала і не размазвала яе, так было б толькі горш для гэтага бялюткага, да таго ж зусім новага дывана.

# ПЕРАКЛАДЧЫЦКІ ДЭБЮТ

# ХАНЬ СУН

***Хань Сун (1965 г. н.) — пісьменнік-фантаст, намеснік старшыні Камітэта навукова-фантастычнай літаратуры Саюза кітайскіх пісьменнікаў, старшыня Сусветнай асацыяцыі кітайскамоўнай фантастыкі. Аўтар твораў «Магільня сусвету», «Чырвоны акіян», «Бальніца», «Метро», «Чырвоная зорка над Амерыкай» і інш. Лаўрэат кітайскіх літаратурных прэмій навуковай фантастыкі «Сін’юнь», «Іньхэ» і інш.***

## У пошуках луна

### 1. Шукальнікі лунаў

Высакахуткасны цягнік накіроўваўся з Пекіна ў Харбін і, задыхаючыся, прабіваўся праз нясцерпную летнюю спёку, усім саставам разносячы ў паветра страшэнны смурод.

Трыццацітрохгадовы шукальнік лунаў Чэнь Ган ляжаў на верхняй паліцы, змагаючыся з млосцю ад гойданкі, і з намаганнем учытваўся ў радкі купленай перад пасадкай кнігі. Гэта было даследаванне вядомага навукоўца Хэ Сіня пад назвай «Лун: міфы і праўда», дзе падрабязна разглядалася гісторыя паходжання кітайскіх драконаў.

На ніжняй паліцы напаўлежачы ўладкаваўся другі шукальнік лунаў па імені Лі Дзе, ён размалёўваў аркуш паперы шарыкавай ручкай. Маляваў ён выключна лунаў, але стылізаваў іх нібы крутых персанажаў мультфільмаў, з доўгімі вусамі і барадой да самых грудзей. Лі Дзе было ўжо трыццаць сем гадоў, ён гандляваў свінінай у Кайфэне, але маляваннем захапляўся з дзяцінства. У адрозненне ад намаляваных Лі Дзе прыгажуноў, луны з кнігі Хэ Сіня былі ікластымі кракадзіламі, пазбаўленымі той надзвычайнай мастацкасці, якую ў іх бачылі шукальнікі лунаў.

Цягнік рухаўся на поўнач і лунам вывіваўся па чыгунцы, ад чаго Чэнь Гана ахапіла пачуццё бязважкасці, нібы ён лунае ў аблоках. Ён не знаходзіў сабе месца, час ад часу прыпыняў чытанне і звешваў галаву, каб зірнуць на таварыша.

У вагоне аказалася неймаверна цесна. Кампанія дунбэйцаў[1] гучна гуляла ў карты, а некалькі кантонцаў[2] без спыну размаўлялі па тэлефоне — з іхняга дыялекту было не разабраць ні слова. Пануры праваднік у бруднай форме сланяўся туды-сюды, прапаноўваў купіць часопісы, на вокладках якіх красаваліся жанчыны ў адкрытых сукенках і мужчыны з пісталетамі. У спёртым паветры стаяў змяшаны пах піва, смажанай курыцы, цыгарэт і локшыны хуткага прыгатавання. На паліцы насупраць Чэнь Гана ляжала сонная дзяўчына, кожныя паўгадзіны яна даставала з касметычкі люстэрка, каб паглядзецца, падмаляваць вусны і прыпудрыцца. Часам размаўляла па тэлефоне — па гаворцы было чуваць, што яна з Сычуані.

Чэнь Ган і Лі Дзе не хацелі гутарыць з гэтымі людзьмі: ім здавалася, што тут, сярод

---

[1] Дунбэйцы — жыхары Паўночнага Усходу Кітая (правінцыі Хэйлундзян, Дзілінь, Ляонін).

[2] Кантонцы — жыхары правінцыі Гуандун (Паўднёвы Кітай), вядомыя сваім дыялектам, які моцна адрозніваецца ад сучаснай кітайскай мовы.

# АРЫНА ПРАНІКАВА

## Хто ты сёння: бард ці чараўнік? Паглыбляемся ў сусвет Dungeons & Dragons[1]

Пра Dungeons & Dragons я ведала раней толькі тое, што такая гульня ёсць. Адзін раз бачыла ў замежным серыяле, і больш ніяк нашыя шляхі не сутыкаліся. Але ў мінулым годзе сяброўка паклікала пагуляць, прычым не ў настольны варыянт, а адразу ў жывую ролевую.

Мой першы персанаж у сэтынгу D&D быў бардам. Вырашыла ўсё скрыпка (хаця не тое каб праз дзесяцігадовы перапынак у нас здаровыя адносіны). Зараз мяне ўжо перанесла за стол. Пазнала ва ўсіх падрабязнасцях, што такое «рак кубоў», нават наступным летам зноў удзельнічаю ў жывой ролевай, але першае, што сказала пасля мінулай: «Я больш ніколі не буду гуляць у гэтае ваша D&D».

Хтосьці лічыць Dungeons & Dragons занадта складанай. Гульнёй для апантаных гікаў без асабістага жыцця. Нават некаторыя майстры плююцца, а потым усё роўна праводзяць кампаніі. Пра D&D могуць гаварыць самымі чорнымі словамі, але пры гэтым зноў і зноў прыходзіць, каб адправіцца ў чарговае падарожжа па фэнтэзі-сусвету з эльфамі, дварфамі і гоблінамі. Ад нянавісці да любві, наадварот, і паўтараюць так некалькі разоў.

[1] Падзямеллі і драконы *(англ.)*.

### Як працуе D&D?

Гульня ў D&D уяўляе сабой падарожжа. Самая класічная завязка, нечым падобная да першых кніг «Ведзьмара»: персанажы чуюць, што трэба вырашыць нейкую праблему, збіраюцца (і часта ўпершыню бачаць адзін аднаго), аб’ядноўваюцца і ідуць біцца. Праблемай могуць быць і гобліны, якія цягаюць нявінных жыхароў вёскі ў лес, і набліжэнне канца свету. Складанасць залежыць ад таго, наколькі доўгай майстар плануе зрабіць кампанію.

Перад тым, як працягнуць размову, нам неабходна разабрацца ў тэрмінах.

***Кампанія** — звязаная серыя падарожжаў персанажаў. Звычайна адзін эпізод займае адзін дзень у гульні (і некалькі гадзін па рэальным часе).*

***Косці** (дайсы) — кубікі, якія выкарыстоўваюцца для гульні. Патрэбныя для баёў, часам для сацыяльнага ўзаемадзеяння. У баявых сцэнах з дапамогай дайсаў вырашаюць, была атака персанажа паспяховай ці не, колькі ўрону нанёс ён і колькі — яму. У сацыяльным узаемадзеянні па кідку кубоў майстар высвятляе, ці можа зрабіць герой тое ці іншае дзеянне, якая інфармацыя яму адкрываецца. Таксама з дапамогай значэння, якое выпала на дайсах, устанаўліваюць чарговасць гульцоў. Насамрэч толькі адна косць з усяго набору выглядае як звыклы куб — d6 (к6). У выглядзе пірамідкі — d4. Астатнія ўяўляюць сабой шматграннікі — d8, d10, d12, d100 і d20. Апошні дайс з’яўляецца сімвалам D&D.*

***Ліст персанажа** — профіль героя, дзе прапісваецца яго імя, раса, клас, здольнасці, ячэйкі заклінанняў, зброя, хіты, занятні і іншае.*

# СТАРОНКА РОДНАЯ

# ЖАННА МІУС

## Мой горад

### Магілёвінак пацеркі

Нямала на свеце
каштоўных караляў,
такіх,
што красуні
сабе ўпадабалі,
такіх,
што здзіўляюць
шматфарбнасцю свету
і выглядам годным
вяшчаюць пра гэта.

Жамчужын зіхценне,
праменнасць бурштыну,
ірдзістая кідкасць
саспелай рабіны:
у пацерках тых —
моды зменлівай воклік…

А што для мяне
ўпадабанае воку?

Вяршую, нанізваю
слова на слова —
збіраю ў адзіна
ўвесь бляск Магілёва:

ільвы,
Заралічац,
кранальнасць муралаў;
фанфарны матыў
трубача-Магіслава;
чырвоны тэатр;
плошча Славы на святах;
шпіль Ратушы,
ў неба задзірыста ўзняты;
з усмешкай Дняпра
новы твар Падміколля;
а ў Буйнічах —
сум гераічнага поля…

І ў тым,
што ўспамінам
жадае застацца,
маіх магілёвінак
пацеркі рдзяцца:

падзеі,
сустрэчы,
абдымкі,
натхненні,
і рытмы,
і рыфмы,
і ўсе летуценні…

### Заралічац

У горадзе М. астролаг
на палец
уздзеў
Сусвет
з безліччу дзёрзкіх зорак
і ціхіх,
сціплых
планет,
з вялікамудрым часам,
што
разлятаецца
ўшыр,
і з таямнічым бясчассем
нязведаных
чорных
дзір.

Нешанцавання полаг
адсунуў ён
левай
рукой —
гораду М. астролаг

# ЛЮСТЭРКА ЛЁСУ

# АЛЯКСАНДР РАДЗЬКОЎ

## Гарады[1]

Асабістыя ўражанні

### Мазыр

У Мазыры ёсць вельмі прыцягальнае для мяне месца. Гэта... кабінет рэктара педінстытута, цяпер педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна. Сам універсітэт размяшчаецца на ўзвышшы, а кабінет рэктара на вугле апошняга, пятага, паверха галоўнага корпуса. З яго вокан адкрываецца неабсяжная панарама на прыгажуню раку Прыпяць. Завітаўшы ў гэты кабінет, я адразу падыходзіў да акна і доўгі час моўчкі глядзеў на чароўныя карціны поймы ракі. І толькі пасля такога рэлаксу здольны быў перайсці да дзелавых размоў з мазырскімі калегамі.

Папраўдзе, з самім Мазыром я пачаў знаёміцца праз рэктараў педінстытута, нават не наведваючы гэты горад.

У сямідзясятых гадах рэктарам Мазырскага педінстытута працаваў доктар педагагічных навук, прафесар Міхаіл Афанасьевіч Дзмітрыеў. Легендарная асоба! Партызан-ардэнаносец, настаўнічаў на Гомельшчыне, быў дырэктарам школы, загадваў раённым аддзелам адукацыі. За вялікія заслугі ў навучанні і камуністычным выхаванні вучняў яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы, што ў нашым адукацыйным асяроддзі рэдкасць, і таму сам гэты факт выклікаў да такіх людзей жывы інтарэс. Міхаіл Афанасьевіч прыязджаў да нас у Магілёўскі педінстытут на навуковую канферэнцыю. Я тады працаваў асістэнтам на кафедры алгебры і геаметрыі, да тэмы той канферэнцыі меў невялікую зацікаўленасць, але на Дзмітрыева пайшоў паглядзець! Такі рэктар даволі годна прадстаўляў не толькі Мазырскі педінстытут, але і сам горад.

Пасля прафесара Дзмітрыева Мазырскі педінстытут узначаліў прафесар Уладзімір Аляксандравіч Дударэнка. А вось з ім я ўжо быў блізка знаёмы і сябраваў, паколькі мы працавалі ў адным навуковым накірунку — тэорыі і методыкі навучання матэматыцы. І што цікава, нягледзячы на яго пранікнёныя расповеды пра Мазыр, пры ім я так і не пабываў там. З Уладзімірам Аляксандравічам мы сустракаліся на рабочых нарадах, на навуковых канферэнцыях, на пасяджэннях вучоных саветаў па абароне дысертацый, але... не ў Мазыры. На пачатку дзевяностых, пасля навуковай канферэнцыі ў Маскве, мы нават разам схадзілі ў Маўзалей Уладзіміра Ільіча Леніна, баючыся, што заўзятыя рэфарматары здольныя яго зачыніць. З прафесарам Дударэнкам мы перапісваліся, сазвоньваліся, давалі адзін аднаму водгукі на навуковыя працы. Але ў Мазыр я так і не патрапіў.

З Магілёва мне не ўдалося спярша наведацца ў гэты горад і тады, калі рэктарам мясцовага педінстытута стаў прафесар Валянцін Васільевіч Валетаў. У Мазыр ён прыехаў з Гомеля, дзе ва ўніверсітэце загадваў кафедрай. Нейкі час казаў, што абавязкова вернецца ў Гомель, але пасля так прыжыўся

---

[1] Працяг. Пачатак у №№ 7—10 за 2025 год і № 2 за 2026 год.

# РАМАН СЭРВАЧ

## Нібыта праходзіць век




Шніп, В. А. Заўтра была адліга — 6 : дзённікавы раман паэта. — Мінск : Звязда, 2026. — 288 с. — (Нацыянальная літаратурная прэмія).

У дзённікавага рамана (так вызначыў жанр сам аўтар) Віктара Шніпа «Заўтра была адліга...» сфарміравалася сур'ёзная кагорта зацікаўленых чытачоў. Пацвярджае тое хуткасць, з якой разышліся папярэднія кнігі з гэтага нечаканага для беларускай літаратуры цыкла. Што ж прываблівае ў суб'ектыўным аглядзе пісьменніка той прасторы, з якою ён звязаны праз усё сваё жыццё?

Асноўныя ідэі аповеда адлюстроўваюць унутраны свет, эмацыйны стан аўтара. Праз канцэпт памяці адбываецца яднанне мінулага і будучыні. Успаміны дапамагаюць адсочваць эвалюцыю думак і пачуццяў. Проза, заснаваная на сістэмным характары вядзення запісаў, дазваляе пісьменніку вяртацца да папярэдніх разваг, каб надаць раней адкрытай рэчаіснасці новую інтэрпрэтацыю.

З кнігі «Заўтра была адліга — 6»: «2.04.2022. Галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Вольга Рацэвіч прапанавала для выдання напісаць пра дзённікі. <...> У школе пра пісьменніцкія дзённікі нічога не ведаў і не чуў. У мяне быў толькі адзін дзённік — дзённік школьнай паспяховасці. Ды і кніжак у нас дома было вельмі мала. Не ведаю, адкуль у мяне з'явілася жаданне запісваць тое, што адбываецца побач, але яно з'явілася. Недзе зімой 1972 года ў адным са школьных сшыткаў за дзве капейкі запісаў, што я, відаць, адзіны чалавек у Пугачах, які ўбачыў у вячэрнім небе, як ляцела хвастатая камета. Гэты запіс у мяне недзе захоўваецца. Трэба шукаць. <...> ...пісьменніцкі дзённік я стаў весці ў 1978 годзе. Мне было васямнаццаць. І я тады яшчэ не думаў, што запісанае можна будзе некалі друкаваць. Проста запісваў, і ўсё. І толькі калі ў 1985 годзе паехаў у Маскву вучыцца ў Літінстытут і там займеў магчымасць прачытаць дзённікі вядомых дзеячаў культуры, вырашыў, што ўсё запісанае некалі надрукую, і ў 2006 годзе свае дзённікавыя запісы, назваўшы іх «Дарога да Храма», упершыню ўключыў у кніжку з вершамі, назваўшы яе «Балада камянёў». На той час у беларускай літаратуры надрукаваных дзённікаў было зусім мала. І ніхто не гаварыў і не пісаў пра літаратурны жанр нон-фікшн. У 2008 годзе ў зборнік паэзіі «Страла кахання. Любові крыж» я зноў уключыў свае дзённікавыя запісы, а потым і ў кнігу «Проза і паэзія агню» (2010). І недзе ў гэты час многія маладыя літаратары, ды і старэйшыя, пачалі актыўна пісаць кароткія нявыдуманыя гісторыі. І літаратуразнаўцы, ды і самі пісьменнікі загаварылі пра папулярнасць новага жанру — нон-фікшн. У 2013 годзе ў мяне выйшла кніжка «Пугачоўскі цырульнік», якая цалкам складзена з дзённікавых запісаў. Чытаючы назву, некаторыя думаюць, што гэта кніжка пра Емяльяна Пугачова, а некаторыя — пра